Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 СТУДЗЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 14 (28124) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Курс — на «Еўрабачанне»**

СТАР. 3

ГЛУША Адамовіча

**Ці быць музею Алеся Адамовіча?**

СТАР. 6

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Перспектывы агульнага рынку фармацэўтыкі**

*ЛІЧБА ДНЯ*

## На 63%

*знізілася колькасць загінуўшых у цёмны час сутак пешаходаў з 2006 года па 2015-ты ў краіне. У Дзяржаўтаінспекцыі звязваюць такую тэндэнцыю з актыўнай прапагандай святлоадбівальных элементаў, якая пачалася ў 2006 годзе пасля зацвярджэння ўказам новых Правіл дарожнага руху, якія абавязалі пешаходаў абазначаць сябе ў цёмны час сутак. Калі ў 2006 годзе на дарогах Беларусі здарылася 2080 ДТЗ з удзелам пешаходаў (загінуў 601 пешаход), то ў 2015-м іх колькасць знізілася да 897 аварый (загінула 223 чалавекі). Флікер дапамагае пешаходу стаць прыкметным на цёмнай дарозе ў святле фар на адлегласці да 400 м, а вадзіцель атрымлівае час прыняць найбольш правільнае рашэнне, каб пазбегнуць наезду на пешахода.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.01.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20746,00 | ▼ |
| Еўра | 22425,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 266,60 | ▲ |
| Укр. грыўня | 834,85 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НЕПАГАДЗЬ НЕ ДАГОНІЦЬ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Грошы

## БЕЛСТАТ ПАДЛІЧЫЎ ЗАРОБКІ

Навукоўцы і радыёвядучыя сталі атрымліваць амаль на трацціну больш

**Намінальна налічаная сярэдняя заработная плата беларусаў у мінулым месяцы склала 7,4 мільёна рублёў. Гэта на 675 тысяч больш (10 працэнтаў), чым у папярэднім месяцы.**

Больш за ўсіх у снежні атрымлівалі мінчане — у сярэднім 10,5 мільёна. А вось заробак жыхароў Магілёўскай і Віцебскай абласцей (самыя нізкія паказчыкі па краіне) склаў 6,2 мільёна.

Каму сталі плаціць больш? На 20—30 працэнтаў, у параўнанні з лістападам, вырас заробак у хімічнай вытворчасці, сферы паветранага транспарту, страхаванні, навуковых даследаваннях і распрацоўках, у галіне кіно, на радыё і тэлебачанні. Амаль на 40 працэнтаў больш, чым раней, атрымлівалі фінансавыя пасрэднікі і спецыялісты, якія займаліся тапографа-геадэзічнай дзейнасцю.

Лідарамі рэйтынгу па аплаце працы застаюцца праграмісты. Іх сярэднестатыстычны даход у снежні раўняўся 30,8 мільёна. Добрымі заробкамі могуць пахваліцца ў хімічнай вытворчасці (16 мільёнаў рублёў). 14—15 мільёнаў у месяц прыносяць вакансіі ў галіне фінансаў і паветранага транспарту. Сярод спецыялістаў, што апынуліся ў нізе спісу, — сацыяльныя работнікі, сельскагаспадарчыя работнікі, што займаюцца раслінаводствам, майстры па рамонце бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання. Але і іх прыбыткі перавысілі 4 мільёны.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Надвор'е

## АМАЛЬ САКАВІЦКАЯ АДЛІГА

**Чакаецца, што сярэдняя тэмпература паветра будзе перавышаць норму на 5—7 градусаў**

**На гэтым тыдні на змену маразам прыйдзе адліга, калі на тэрыторыю Беларусі завітае сапраўды цёплае і вільготнае надвор'е з туманамі, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**



Гэтымі днямі настане такое цяпло, якое характэрна для другой паловы сакавіка. А ўвогуле цяпер атлантычныя цыклоны і звязаныя з імі атмасферныя франты прынясуць на нашу тэрыторыю цёплыя і вільготныя паветраныя масы з акіяна.

Ужо ў аўторак у многіх раёнах чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах галалёд, наліпанне мокрага снегу, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 3 градусаў на захадзе да 5 марозу па ўсходзе краіны. У сераду прагназуецца мокры снег і дождж. Месцамі магчымы туман, галалёд, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Істотна пацяплее. Нават уначы тэмпература паветра складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень чакаецца ад нуля да 6 цяпла.

Амаль што вясна прыйдзе да нас у чацвер. У гэты дзень часам будзе ісці невялікі дождж. У асобных раёнах магчымы туман. Уначы і раніцай па ўсходзе захаваецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Па паўночным захадзе ўдзень чакаецца ўзмацненне ветру да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 градуса да плюс 5, удзень — ад нуля да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу месцамі прагназуюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі магчымыя туман і галалёд. Уначы і раніцай на дарогах у асобных раёнах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, а ўдзень — ад 1 марозу да плюс 5 градусаў. Дажджлівае надвор'е чакаецца і на выхадных, калі тэмпература паветра ўдзень месцамі будзе дасягаць плюс 7 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*